**Н. А. Поляк**

Кафедра філасофіі і паліталогіі, Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

УДК 94(476)

# МІЖКАНФЕСІЙНЫЯ СТАСУНКІ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ДЗЯРЖАВАТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАХ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVIII ст.

У артыкуле асвятляюцца падзеі, звязаныя з міжканфесійнымі адносінамі на беларускіх землях у другой палове XVIII ст., якія сталі прычынай замежнага ўмешвання ў палітыку Рэчы Паспалітай і перашкодай у функцыянаванні дзяржавы як адзінага палітычнага суб’екта.

**Ключавыя словы:** Рэч Паспалітая, поліканфесійнасць, замежная экспансія, абарона аднаверцаў, дзяржаватворчыя працэсы.

**Узор цытавання:** *Поляк Н. А.* Міжканфесійныя стасункі на беларускіх землях у дзяржаватворчых працэсах Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII ст. // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2020. № 2. С. 75–79.

ИСТОРИЯ

**N. Poliak**

Department of philosophy and political science, Belarusian State Medical University, Minsk, Belarus

# INTERFAITH RELATIONS IN THE BELARUSIAN LANDS IN THE STATE-BUILDING PROCESSES OF THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH IN THE SECOND HALF OF THE 18TH CENTURY

The article talks about the relations between confessions on the Belarusian lands in the second half of the 18th century, which caused foreign interference in the politics of the Polish-Lithuanian Commonwealth and impeded the functioning of the state as a single political entity.



**Keywords:** Polish-Lithuanian Commonwealth, multi-confessionalism, foreign expansion, protection of fellow believers, state-building processes.

**For citation:** Poliak, N. (2020). Interfaith relations in the Belarusian lands in the state-building processes of the Polish-Lithuanian Commonwealth in the second half of the 18th century. *Sophia*, 2, 75–79 (in Belar.).

**Аўтар:**

**Наталля Аляксандраўна Поляк** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі БДМУ.
*Polyak77@mail.ru*

**Author:**

**Natalia Poliak** – PhD in history, associate professor of the department of philosophy and political science, BSMU.

Рэч Паспалітая – вялікая еўрапейская краіна, уваход у склад якой стаў значным гістарычным этапам на шляху развіцця беларускай дзяржаўнасці. Больш за 200 гадоў гісторыі Беларусі былі звязаны з народамі Польшчы, Літвы і Украіны і прайшлі

пад уплывам і заходне-, і ўсходнееўрапейскай цывілізацый. Федэратыўная дзяржава аб'ядноўвала некалькі палітычных суб'ектаў і разам з тым была падзелена як рэлігійна, так і культурна. У яе межах было распаўсюджана каталіцтва, праваслаўе, уніяцтва, пратэстантызм і стараверства. Значную ролю ў грамадскіх і палітычных працэсах адыгрывалі іўдаізм і мусульманства. Гэтую сітуацыю красамоўна дэманстравалі міжканфесійныя адносіны на беларускіх землях у XVII і XVIII стст. Рэлігія ў той час выконвала ідэалагічныя функцыі і з'яўлялася падмуркам улады. Факт шматканфесійнасці, несумненна, ускладняў палітычнае функцыянаванне і замаруджваў працэсы дзяржаўнага развіцця.

Палітыка ўлад Рэчы Паспалітай у адосінах да некатолікаў на працягу XVII і XVIII стст. вызначалася абмежаваннем іх палітычных і грамадзянскіх правоў, праследам вернікаў, зачыненнем святынь, школ, бібліятэк, перашкодамі ў адпраўленні культаў.

Палітычны статус Кароны і Княства значна пагоршыўся пасля таго, як іх унутраныя міжканфесійныя праблемы сталі прадметам палітыкі суседніх краін. Пачаліся працэсы «раздзяржаўлівання» Рэчы Паспалітай і замаруджвання палітычнага афармлення народаў ВКЛ. Сярод еўрапейцаў ствараўся негатыўны імідж польска-літоўскага грамадства [8, с. 45].

Пачаткам інтэрналізацыі міжканфесійных стасункаў на беларускіх землях стаў падпісаны ў 1660 г. Аліўскі мір. Заключаны паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй па выніках вайны 1655–1660 гг., гэты дакумент агаворваў прававы статус пратэстантаў Кароны і ВКЛ, а гарантам яго выканання абвяшчалася Прусія. Падпісаны ў 1686 г. «вечны мір» гарантаваў праваслаўнаму насельніцтву абарону правоў і падтрымку з боку Маскоўскай дзяржавы. Гэта паклала пачатак афармлення так званага дысідэнцкага пытання, якое «вырашылася» праз падзелы Рэчы Паспалітай на часткі.

Пасля смерці ў 1725 г. імператара Пятра I адносіны да дысідэнцкага пытання ў ВКЛ змяніліся як з боку польскага, так і з боку расійскага і прускага ўрадаў. Манархаў Расіі ў 1720–40 гг. займалі іншыя знешнепалітычныя праблемы (руска-турэцкая вайна 1736–1739 гг., руска-шведская вайна 1741–1743 гг. і інш.). Адбыўся перагляд расійскай стратэгіі і тактыкі ў дысідэнцкім пытанні. Прававая падтрымка праваслаўнага і пратэстанцкага духавенства з-за мяжы ў 1720-х гг. аслабла, і гэта, на думку польскага даследчыка В. Смаленскага, стала вытокам узмацнення барацьбы каталіцкай улады за сваё панаванне. Інакш кажучы, польскі каталіцызм спрабаваў выкарыстаць зручную сітуацыю для ўпарадкавання ўнутрыканфесійных спраў [10, с. 15].

Канфесійнае пытанне зноў было выкарыстана замежнымі краінамі ў час «бескаралеўя» і абрання новага караля Рэчы Паспалітай у 30-х гг. XVIII ст. Вайна за «польскую спадчыну» скончылася каранацыяй Аўгуста III Саса, які шчыра раздаваў прывілеі праваслаўным у абмен на ўзброеную падтрымку з боку Расіі.

Пераламіць сітуацыю на сваю карысць дысідэнты імкнуліся рознымі спосабамі. Спрабавалі праз пасрэднікаў зрываць соймы і павятовыя соймікі, на павестку якіх выносіліся антыдысідэнцкія пастановы. Так, напрыклад, у вальных соймах 1738, 1748, 1752, 1756, 1761 гг. прымаў удзел кальвініст з Ваўкавыскага павета Ян Стэфан Алендзкі, што сведчыла аб наяўнасці прадстаўнікоў апазіцыі. Але аб дакладных формах яго працы звестак не захавалася. Для выпраўлення сітуацыі дысідэнты звярталіся па дапамогу да ўплывовых дзяржаўных саноўнікаў. Яны знаходзілі разуменне, спачуванне і грашовыя датацыі ў канцлера ВКЛ Міхала Вішнявецкага, літоўскіх гетманаў

Станіслава Дэнгофа, Станіслава Хаментоўскага, падскарбія літоўскага Міхала Фрыдрыха Чартарыйскага. Наогул, пратэстанты знаходзілі падтрымку сярод княскіх магнацкіх родаў Радзівілаў, Сапегаў, Вішнявецкіх.

З узыходжаннем у 1741 г. на расійскі прастол Лізавета Пятроўна спрабавала ўключыцца ў змаганне за правы сваіх беларускіх аднаверцаў, аднак рабіла яна гэта галоўным чынам дзеля таго, каб не страціць ужо дасягнутых вынікаў у справе падрыву дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай. У 1743 г. праз свайго міністра імператрыца ў пагрозлівай форме звярнулася да караля Аўгуста III, якому нагадвала, што шмат хто ў Еўропе ўстурбаваны міжканфесійнай напружанасцю ў Польшчы і ВКЛ. Каб не парушыць добрасуседства, яму трэба, згодна падпісанаму мірнаму пагадненню, пакласці канец ганенням на дысідэнтаў. Годам пазней расійскі рэзідэнт П. Галембоўскі папярэджваў польскага прымаса, што імператрыца мае рашучыя намеры і зробіць усё магчымае, каб адшукаць дзейсныя сродкі абароны пакрыўджаных [2, арк. 73]. Праўда, Калегія замежных спраў Расіі заклікала сваіх дыпламатаў да разважлівасці і нагадвала, што ў чужой дзяржаве нельга, ды і небяспечна ўжываць іншыя сродкі акрамя дыпламатычных зваротаў да караля і чыноўнікаў.

У адказе на грамату Лізаветы Аўгуст III патрабаваў прывесці дакладныя доказы праследу «схізматыкаў». Той, хто сутыкнуўся з несправядлівым стаўленнем да сябе, нагадваў кароль, павінен звяртацца не да замежных двароў, а ў айчынныя суды і трыбуналы. Паказальным у гэтым плане стаў выпадак з віцебскім шляхціцам Пятром Ельяшэвічам, якога судзілі за тое, што ён паскардзіўся на базыльян не ў Трыбунал ВКЛ, а ў Сінод і меў прыватныя кантакты з маскоўскім дваром [1, с. 310]. У 1746 г. з'явілася каралеўская інструкцыя аб стварэнні спецыяльнай камісіі для разбору ўзаемных крыўдаў. Але справа з арганізацыяй такой камісіі зацягнулася. Ніводзін з бакоў не праяўляў жадання ўдзельнічаць у яе працы. Беларускае праваслаўнае духавенства адмаўлялася сустракацца з каталіцкімі калегамі [6, с. 497].

У развіцці супярэчлівых міжканфесійных стасункаў, што адмоўна ўплывалі на дзяржаўнасць, надыйшоў апошні перыяд, які характарызаваўся намаганнямі дысідэнтаў і іх апекуноў не дапусціць далейшага абмежавання некатолікаў у правах, а таксама спробамі ўлады ўзмацніць дзяржаву шляхам акаталічвання. Ціск, які адчулі на сабе дысідэнты Беларусі ў сярэдзіне XVIII ст., можна разглядаць не столькі як праяву рэлігійнай і нацыянальнай нянавісці з боку католікаў, колькі як «прыпадак хворага дзяржаўнага арганізма» [4, с. 35], які шукаў паратунку ва ўмовах пагаршэння ўнутры- і знешнепалітычнай сітуацыі. Дысідэнты, якія неаднойчы аказваліся ў эпіцэнтры рэлігійна-палітычных падзей, адчувалі на сабе спробы дзяржавы вырашыць свае праблемы за іх кошт.

Якасна новы этап у развіцці дысідэнцкага пытання пачаўся з прыходам да ўлады Кацярыны II. Ускоснае дамінаванне Расіі ў Рэчы Паспалітай пры ёй перарасло ў прамое. Сумесныя дзеянні Магілёўскага праваслаўнага епіскапа Г. Каніскага і ініцыятыўнай імператрыцы, падтрыманыя пруской дыпламатыяй, сталі вырашальнымі не толькі для царкоўна-рэлігійнага жыцця Беларусі, але і для лёсу ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Паглыбленню расколу польска-літоўскага грамадства і аслабленню дзяржаўнай каталіцкай улады садзейнічала пратэстанцкая супольнасць Беларусі. За 1748–1768 гг. у Літоўскай правінцыі колькасць кальвінісцкіх збораў істотна зменшылася, але, тут у ВКЛ, іх было болей, чым у Малапольскай і Вялікапольскай правінцыях (пратэстанцкія аб'яднанні ў Польшчы) разам узятых [3, с. 364]. Закрыццё кальвінісцкіх

збораў на беларускіх землях адбывалася радзей, бо яны, як правіла, узнікалі тут адразу як пратэстанцкія, а не перарабляліся з касцёлаў, як гэта было ў Польшчы, і мелі моцную падтрымку з боку мясцовай шляхты. Яшчэ адной прычынай устойлівасці пратэстанцкіх супольнасцей на беларускіх землях, у параўнанні з іншымі тэрыторыямі Рэчы Паспалітай, была невялікая колькасць тут каталікаў, якія выступалі галоўнымі ініцыятарамі ліквідацыі кальвінісцкіх збораў. Паводле даных польскага гісторыка С. Літака, у апагейныя для каталіцызму 70-я гг. XVIII ст. у Навагрудскім, Брэсцкім, Мсціслаўскім, Віцебскім, Полацкім, Мінскім ваяводствах адзін парафіяльны касцёл прыходзіўся на тэрыторыю ад 579 км² да 2 100 км². Для параўнання: у ваяводствах Малой і Вялікай Польшчы – на плошчу ад 53 км² да 84 км² [9, с. 60].

Такім чынам, кальвіністам Беларусі і Літвы ўдавалася ў 40–60-я гг. XVIII ст. праз шляхецкае прадстаўніцтва ўдзельнічаць у грамадска-палітычным жыцці дзяржавы. Яны накіроўвалі сваіх прадстаўнікоў на соймы, арганізоўвалі культурна-асветніцкія праекты, прымалі ўдзел у эканамічных і адміністрацыйных справах. У гістарычных крыніцах час ад часу сустракаюцца прозвішчы царкоўных і свецкіх лідараў кальвінізму з ліку беларуска-літоўскай шляхты, якія актыўна дзейнічалі ў рэлігійнай, адукацыйнай і культурнай сферах і на розных узроўнях абаранялі сваё веравызнанне: Волан, Эсткоў, Воўк-Ланеўскі, Алендзкі, Мацкевіч, Грабоўскі, Пшыстаноўскі, Незабітоўскі, Абрамовіч і інш.

Пратэстанцкае духавенства рэальную магчымасць захаваць свае пазіцыі ў ВКЛ бачыла ў замежных сувязях. Пры евангеліцкім правінцыйным сінодзе традыцыйна прызначаўся чалавек, адказны за наладжванне кантактаў з замежжам і з мясцовай свецкай уладай. Кальвіністы ВКЛ знаходзілі магчымасць прыцягнуць увагу міжнароднай супольнасці да сваіх праблем праз публікацыі артыкулаў у замежных перыядычных выданнях. Часцей за ўсё падобныя артыкулы з'яўляліся ў пратэстанцкай Прусіі. З другой паловы XVIII ст. увага ўрада Рэчы Паспалітай да зместу публікацый за мяжой узрасла. Цэнзура была занепакоена тым, што сярод апісання рэлігійнага жыцця кальвіністаў і лютэран Княства і Кароны з'яўляліся звесткі палітычнага характару [5, с. 111]. Ускосным доказам кантактаў пратэстантаў Беларусі з Прусіяй можа быць факт, зафіксаваны ў Магілёўскай хроніцы. Пад 1755 г. летапіс паведамляе, што ў карыстанне ўвайшла пруская манета, але была ў абароце непрацяглы час [7, с. 77].

Такім чынам, у другой палове XVIII ст. у вырашэнні дысідэнцкага пытання на Беларусі назіраўся працяг палітыкі, пачатай яшчэ ў XVII ст. Ёй былі ўласцівы спробы праваслаўных і пратэстантаў з дапамогай замежных апекуноў прыпыніць далейшае выцісканне іх з грамадска-палітычнага жыцця Княства. Каталіцкія ўлады, наадварот, імкнуліся пазбавіць іх правоў, тым самым абмежаваць уплыў замежных краін і ўніфікаваць дзяржаву ва ўсіх адносінах. Рэальных дзеянняў, праўда, ні адзін з бакоў не прадпрымаў: пакідаліся без увагі звароты імператрыцы Лізаветы да ўрада Рэчы Паспалітай (1743, 1749, 1752), не была створана «скаргавая камісія», ігнараваліся звароты праваслаўнага святарства, шляхта Рэчы Паспалітай дыстанцыравалася ад палітычных рашэнняў і ўвогуле не ўзнімала дысідэнцкае пытанне на соймах. Дзяржаўны крызіс быў відавочным і паглыбляўся. Кансерватыўнасць сацыяльна-палітычнай структуры грамадства, адсутнасць своечасовых рэформ разам з замежным умешваннем садзейнічалі так званаму «раздзяржаўліванню» федэрацыі. Вытокі беларускай дзяржаўнасці, якія закладаліся ў часы існавання Рэчы Паспалітай, таксама адчувалі моцны

негатыўны ўплыў і зараджаліся ва ўмовах шматканфесійнасці, полікультурнасці і пад уплывам розных цывілізацый.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Беднов, В. А.* Православная церковь в Польше и Литве / В. А. Беднов. – Минск: Лучи Софии, 2002. – 430 с.

2. Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве (AGAD). Архіў Радзівілаў. – Ф. II. Гістарычныя дакументы. Кн. 50.

3. *Грыцкевіч, А. П.* Рэлігійнае пытанне і знешняя палітыка царызму перад падзеламі Рэчы Паспалітай / А. П. Грыцкевіч // Весці Акадэміі навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1973. – № 6. – С. 62–71.

4. *Костомаров, Н. И.* Старый спор. Последние года Речи Посполитой / Н. И. Костомаров. – М.: Чарли; Смоленск: Смядынь, 1994. – 768 с.

5. *Кригзайзен, В.* Положение протестантов в Речи Посполитой в освещении немецких периодических изданий XVIII в. // В. Кригзайзен // Россия, Польша, Германия в европейской и мировой политике XVI–XX вв.: сб. ст. по матер. междунар. конф., Смоленск, июнь 2001 г. – М.: Индрик, 2002. – С. 99–115.

6. Памятники православия и русской народности в Западной России в XVII–XVIII вв. / под ред. Ф. Титова. Т. 1: Акты по истории заграничных монастырей Киевской епархии XVII–XVIII вв. Ч. 2. – Киев: Тип. И. И. Чоколова, 1905. – XXXV–LXVI, 529–1136 с.

7. *Трубницкий, А.* Хроника белорусского города Могилева, собранная и писанная Александром Трубницким, регентом Могилевской магдебургии, во второй половине XVIII века, а в первой половине XIX века продолженная его сыном, губернским секретарем Михаилом Трубницким / А. Трубницкий, М. Трубницкий. – М.: Университетская типография (М. Каткова), 1887. – 142 с.

8. *Dygdała, J.* Kwestia dysydencka w Rzeczypospolitej doby bezkrólewia 1733 roku / J. Dygdała // Zapiski Historyczne. – 1997. – T. 62. – Zesz. 4. – S. 45–67.

9. *Litak, S.* Parafie w Rzeczypospolitej w XVI–XVIII wieku. Struktura, funkcje społeczno-relegijne i edukacyjne / S. Litak. – Lublin: Wyd-wo KUL, 2004. – 515 s.

10. *Smoleński, W.* Przewrót umysłowy w Polsce wieku XVIII. Studia historyczne / W. Smoleński. – Kraków: G. Gebethner i sp.; Petersburg: br. Rymowicz, 1891. – 424 s.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.09.2020.*